# Да Міжнароднага дня роднай мовы

Мэта: пазнаёміць вучняў з гісторыяй узнікнення Міжнароднага дня роднай мовы, са становішчам беларускай мовы ў нашай дзяржаве, у школе, на аснове літаратурных і музычных твораў паказаць прыгажосць роднага слова, багацце нашай духоўнай спадчыны, праз праведзеную літаратурную віктарыну заахвоціць вучняў ведаць сваю культуру, літаратуру, гісторыю сваёй краіны, свайго народа, выхоўваць любоў і павагу да матчынай мовы, беражлівыя адносіны да нацыянальнай мовы народа.

Гучыць песня пра беларускую мову ў выкананні “Песняроў”

Добры дзень!

Мы вітаем вас у нашай школе!

21 лютага абвешчаны Міжнародным днём роднай мовы на 30-й сесіі ЮНЕСКА па прапанове Бангладэша ў 1999годзе.

Дзень святкавання — 21 лютага быў абраны таму, што ў гэты дзень у 1952годзе загінулі пяць студэнтаў, якія змагаліся за наданне мове бангла статуса дзяржаўнай у тагачасным Пакістане, усходняя частка якога пазней стала незалежнай дзяржавай Бангладэш.

Па дадзеных ЮНЕСКА ў свеце існуе больш за 6000 моў, 95% з якіх знаходзіцца ва ўжытку ў насельніцтва планеты. Частка моў не мае сваёй пісьменнасці.

Больш за палову існуючых моў свету знаходзяцца на мяжы вымірання. Тысячы моў не выкарыстоўваюцца ў сістэме адукацыі і не прадстаўлены ў Інтэрнеце.



Кожны месяц знікаюць 2 мовы. Яшчэ нядаўна налічвалася да 8000 самастойных моў. Сёння іх на 2000 менш. Пад пагрозай знікнення каля 3000 моў.

Няхай нават сёння беларуская мова моцная, распаўсюджаная, абароненая заканадаўствам, але няма гарантыі, што ўжо заўтра яна не трапіць у спіс тых трох тысяч,

гатовых знікнуць. На вялікі жаль, наша мова ўсё ж пад пагрозай забыцця, нягледзячы на тое, што ў Рэспубліцы Беларусь яна разам з рускай мовай лічыцца дзяржаўнай.

Ці здарыцца гэта, ці дапусцім, --усё залежыць ад нас саміх. Бо пакуль жыве мова—жыве і народ. А калі мы адрачомся ад сваёй мовы, то хто мы тады без мовы!? Ці беларусы, ці рускія, ці проста тутэйшыя?

Толькі мы гаворым ні па-беларуску, ні па-руску, а на трасянцы. Не на дыялекце, а іменна на трасянцы руска-беларуска-ніякай. Хіба гэта не самая горшая абраза ўсёй нацыі, усяму народу!?

Дарэчы, у час апошняга перапісу роднай мовай назвалі беларускую 5 мільёнаў 58 тысяч чалавек. Хіба ж мы маем права здрадзіць свайму народу, сваёй гісторыі?

Гэтыя ўступныя словы гучалі і ў мінулым годзе. Не паўтарыцца мы не маглі. Гэтыя звесткі сапраўды важныя, надзённыя, балючыя для тых, хто па-сапраўднаму любіць сваю зямлю, сваю мову, сваю Бацькаўшчыну, хто не абыякавы да сваёй будучыні, да будучыні сваёй дзяржавы.

Ці не варта задумацца пра тое, што Міжнародны дзень роднай мовы адзначаецца звычайна тымі, хто працуе з беларускай мовай, беларускай культурай.

У нас жа дзве дзяржаўныя мовы—руская і беларуская. А Міжнародны дзень роднай мовы мы чамусьці звязваем іменна з беларукай мовай. Значыць, калі мы дома, з бацькамі, дзядулямі, бабулямі, то гаворым па-беларуску, на нашай роднай мове, нават пра гэта не здагадваючыся. Атрымліваецца, што для большасці з нас роднай з'яўляецца іменна беларуская мова.

Мы чамусьці аказаліся ў тым становішчы, што нават у вялікім свеце саромеемся, не рашаемся гаварыць па-беларуску, хаця жывём у Рэспубліцы Беларусь!

Ці задумваліся мы калі-небудзь пра гэта? Ці ўздымаюцца такія пытанні на ўроках гісторыі, на класных гадзінах, на іншых уроках? Мусіць, не. А чаму?

Ці не таму, што большасці з нас стала ўсё роўна, што мы, беларусы, стараемся не прызнавацца ў гэтым і з усіх сіл імкнёмся гаварыць па-руску. А таго не разумеем, што і па-руску мы гаварыць не ўмеем.

Вось пагэтаму мы, як нацыя, ніхто, тутэйшыя, як назваў нас на пачатку 20 ст. Я.Купала. З таго часу не змянілася нічога!

А каб нас у свеце прызнавалі, трэба нам саміх сябе пазнаць, прызнаць, паважаць сябе як нацыю!

Вывучыць сваю гісторыю, сваю культуру, сваю літаратуру, каб не сорамна было за сябе, за сваю Бацькаўшчыну! А вучыць ёсць што!

Вам гэта зрабіць цяжэй, бо сёння ў школе абмежаваная колькасць урокаў літаратуры, асабліва ў старэйшых класах. Ды і ўрокаў гісторыі мала. Не здаём мы і экзамен па літаратуры. Давайце паглядзім, да чаго гэта школьнікаў, а потым выпускнікоў прывяло?

*Гучыць "Спадчына" ў выкананні "Песняроў".*



Літаратурная віктарына

1.Самая славутая жанчына старажытнасці і чаму славутая? (Рагнеда).
2. Вядомы кіеўскі князь, сын Рагнеды (Яраслаў Мудры).
2.Самая вядомая старажытная асветніца і святая заступніца беларусаў? (Ефрасіння Полацкая).
3.Дзе пакояцца мошчы святой? (Полацк)
4. Беларускі "златавуст" і яго месцанараджэнне. (Кірыла Тураўскі, г. Тураў).
5. У якім старажытным творы 12 стагоддзя ўпамінаецца імя славутага полацкага князя Усяслава? ("Слова пра паход Ігаравы).

На сёмым веку Траянавым кінуў Усяслаў жэрабя на дзеўчыну сабе любую. Сам хітрасцю асядлаў коней і скокнуў да горада Кіева, і дакрануўся дзідаю залатога стала кіеўскага. Скокнуў ад іх лютым зверам апоўначы з Белгарада, ахутаўся сіняю імглою, раніцай ударыў сякерамі: адчыніў вароты Ноўнарада, збіў гонар Яраславаў, скокнуў ваўком да Нямігі з Дудутак. На Нямізе снапы сцелюць галовамі, малоцяць цапамі харалужнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела. Нямігі крывавыя берагі не дабром былі засеяны: засеяны косцьмі рускіх сыноў. Усяслаў-князь людзей мірыў, з княскімі гарадамі дамаўляўся, а сам па начах воўкам рыскаў: з Кіева дасягаў да пеўняў

Тмутаракані, вялікаму Хорсу воўкам шлях перацінаў. Яму ў Полацку пазванілі ютраню рана ў званы святой Сафіі, а ён у Кіеве звон пачуў. Хоць і вешчая душа была ў адважным целе, але часта ад бедаў цярпеў. Яму вешчы Баян першаму прыпеўку мудрую [склаў], кажучы: "Ні хітраму, ні ўмеламу, ні птушцы выкрутлівай суда Божага не мінуць!"

1. У адным са сталічных горадоў нашых у 1522 годзе была надрукавана перша беларуская кніга "Малая падарожная кніжка". Назва горада і аўтар кнігі. (Вільня. Ф.Скарына).
2. На пачатку 16 ст. на Беларусі пачалося кнігадрукаванне. Хто, дзе і дзякуючы каму пачаў кнігадрукаванне на тэрыторыі Беларусі? (Сымон Будны. Нясвіж. 1562г. Князі Радзівілы).
3. Хто з'яўляецца аўтарам "Песні пра зубра" і які князь там услаўляецца? (М.Гусоўскі. Вітаўт).
4. Хто прынёс кнігадрукаванне ў Масковію? (Іван Фёдараў--Федаровіч і Пётр Мсціславец—па паходжанні беларусы).
5. Хто стварыў славуты Статут ВКЛ? (Ян Сапега—беларус).
6. Хто ўнёс значныя папраўкі ў рускую азбуку і прыблізіў да сучаснага сённяшні алфавіт? (Ілья Капіевіч—беларус).
7. Назавіце найбольш вядомыя імёны нашых пісьменнікаў-асветнікаў канца 19 пачатку 20 ст. (Д.-Марцінкевіч, К.Каліноўскі, Ф.Багушэвіч).
8. Самыя вядомыя паэты пачатку 20 стагоддзя (Я.Купала, Я.Колас, Цётка, М.Багдановіч)

Прафесар Пецярбургскага ўніверсітэта Эпімах Шыпіла не паэт, але меў дачыненне да нашай літаратуры Ён адзін са стваральнікаў выдавецтва "Загляне сонца і ў наша аконца", дзе выдаваліся ўсе асноўныя творы беларускіх аўтараў: В.Д.-Марцінкевіча, Ф.Багушэвіча К.Каліноўскага, Я.Купалы, Я.Коласа, Цёткі… ).

14.Чытаем верш, не называючы аўтара. Гэты верш павінен быў быць гімнам Рэспублікі Беларусь і адпаведна гербам была б "Пагоня", але не сталі імі па розных прычынах. Хто аўтар гэтага верша-песні?



Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, -
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў па грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, -
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не
стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі - гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Бійце ў сэрцы іх - бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не
стрымаць.



15.Хто па нацыянальнасці і па месцынараджэння карэнны расіянін унёс вялікі ўклад у развіццё беларускай песеннай культуры? (У.Мулявін)

(Уладзі́мір Гео́ргіевіч Муля́він — беларускі артыст, кампазітар, народны артыст Беларусі (1979), Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1980), народны артыст СССР (1990), заснавальнік і

мастацкі кіраўнік беларускага вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры».

Нарадзіўся 12 студзеня 1941 года ў Свярдлоўску У дзіцячым узросце пачаў захапляцца музыкай і ў 12-ці гадовым узросце пачаў граць на гітары.

У 1956 годзе — пасля школы паступіў у Свярдлоўскае музычнае вучылішча, на аддзяленне струнных інструментаў. Быў выключаны з вучылішча за захапленне джазам, хутка быў прыняты назад, але кінуў па ўласным жаданні. У 1958—1963 гадах працаваў музыкам у розных абласных філармоніях. У 1963годзе быў запрошаны на працу ў Беларускую дзяржаўную філармонію. У 1965—1967 гадах служыў у Савецкім войску ў наваколлі Мінска. Стварыў у вайсковай частцы вакальны квартэт, прыймаў удзел у арганізацыі ансамбляБеларускай ваеннай акругі.

Пасля сканчэння службы ў войску вярнуўся ў Беларускую дзяржаўную філармонію, пры якой у 1968 годзе быў створаны вакальна-інструментальны ансамбль «*Лявоны*». У 1970 годзе ансамбль, мастацкім кіраўніком якога быў Уладзімір Мулявін, змяніў назву на «Песняры».

14 мая 2002 года Уладзімір Мулявін патрапіў у аўтакатастрофу. Праз 8 месяцаў памёр у Маскве ў шпіталі імя Бурдэнкі.

Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. У гонар Уладзіміра Мулявіна ў Мінску названы бульвар.

Напішам на дошцы прозвішчы і імёны тых пісьменнікаў і паэтаў, творчасць якіх мы вывучалі або пра якіх упаміналі на ўроках літаратуры і гісторыі.





Пытанні могуць быць зададзены яшчэ, але і час наш абмежаваны ды і вы адчулі, што ведаеце, чаго не ведаеце.

Ёсць такі выраз: а хто, калі не мы? Час выбраў вас. Вы маладыя, за вамі будучыня. І будучыня нацыі ў маладых руках. Вазьміце ўсё, створанае старэйшымі пакаленнямі, не патрацьце гэта і дадайце сваё,

каб вам было што перадаць наступным пакаленням. Толькі тады не загіне наша нацыя, а пазнаць яе можна ў першую чаргу па мове.



*Чытае свой верш Манько С.С.*

Аб роднай мове
Мы амаль не ўжываем
Беларускія словы.
Стала роднай чамусьці
Для нас руская мова.

Але ж мы, беларусы,
Мы сваю мову маем.
Дык чаму ж, не пайму я,
Мы яе забываем?

У нас прыгожая мова,
Мілагучная мова.
Так цудоўна гучаць
Беларускія словы!

Беларуская мова—
Мова продкаў-ліцвінаў.
Згіне мова народа—
І народ сам загіне.

Трэба родную мову
Шанаваць, як святыні,
Каб не выпаў ёй лёс
Той, што выпаў латыні.



Францішак Багушэвіч у канцы 19 стагоддзя напісаў для ўсіх будучых пакаленняў:” Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная. Яно добра, а нават і трэба ведаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю.

Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш сваю мову, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займае, пасля і зусім памерлі.

Не пакідайце - ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмерлі!

Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе, ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы".

Дык ці можна адрачыся ад таго, што нам Богам дадзена. Гэта ж грэх вялікі. Гэта ж богаадступніцтва.

Так што беражыце тое, што нам Богам дадзена, бо гэта самы дарагі падарунак—жыццё і мова. Толькі тады мы -- беларускі народ, калі мы з гонарам будзем насіць імя—беларус, беларуска ў краіне Бе-ла-русь.

Чытайце нас на сайце па сённяшняй тэме—тэме роднай мовы і нашай Беларусі.

*Гучыць песня "Малітва" ў выкананні "Песняроў".*

Дзякуем за ўвагу!